13. *Ястребов И. Б.* Католицизм в современной Франции (Очерк социально-политических позиций». М. : Мысль, 1973. 192 с.

14. *Davies M.* Pope John's Council. Liturgical Revolution – Volume Two. Dickinson : Angelus Press, 1977. 352 p.

15. *Radecki F., D. Radecrk.* Tumultuous Times. The Twenty General Councils of the Catholic Church and Vatican II and its Aftermath. Wayne : St. Joseph's Media, 2004. 655 p.

16. *Wiltgen R.* The Rhine Flows into the Tiber. A History of Vatican II. Rockford, TAN Books, 1985. 304 p.

***Лебедзева І. В.***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт* (*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*)

## ДЗЕЦІ Ў САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫХ ПРАЦЭСАХ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПЫТАННЯ

Дзяцінства – дынамічны элемент сацыяльнай сістэмы, які залежыць ад агульных заканамернасцяў развіцця грамадства. Гісторыя дзяцінства непасрэдна звязана з даследаваннем сям'і і прыватнага жыцця. Перыяд другой паловы XIX – пачатку XX ст. у айчыннай гісторыі характарызуецца грунтоўнымі трансфармацыйнымі працэсамі. Яны ахапілі ўсе сферы жыцця грамадства і выклікалі адпаведныя змены ў паводзінах дзяцей і падлеткаў, у адносінах грамадства да гэтай катэгорыі насельніцтва. Найперш гэта было абумоўлена рэзкімі зменамі ў сістэме традыцыйных норм паводзінаў, якія заўсёды найперш закранаюць дзяцей.

Асобнай і даволі складанай праблемай з'яўляецца вызначэнне саміх межаў дзяцінства. У розных катэгорый насельніцтва Беларусі даследуемага часу гэтыя межы былі розныя і залежалі ад узроўню жыцця, адукацыі, традыцыі і інш. У расійскай заканадаўчай сістэме на працягу XIX ст. адбылося шмат значных эвалюцыйных зменаў, перш чым канчаткова нарматыўна вызначылася заканадаўчае афармленне межаў дзяцінства і прававых магчымасцей гэтай катэгорыі насельніцтва [27, с. 37]. Узрост непаўналецця прадугледжваў некалькі перыядаў: ад нараджэння да 14 гадоў, ад 14 да 17 і ад 17 да 21 года. Дакументамі, якія з'яўляліся падцвярджэннем узросту, лічыліся прыходскія (метрычныя) кнігі, дваранскія радаслоўныя, гарадавыя абывацельскія кнігі і рэвізскія сказкі, а таксама пісьмовае сведчанне святара, які хрысціў, і сведкаў гэтай падзеі [11, с. 1].

Праблема вывучэння гісторыі дзяцінства бачыцца, перш за ўсё, у дваістасці разумення самога дзяцінства. Дзеці ўяўляюцца вучонымі і як аб'ект, і як суб'ект даследавання. Традыцыйныя гуманітарныя навукі вывучаюць дзяцінства як аб'ект і прадукт дзейнасці дарослых, – як дарослыя ўяўляюць сабе свет дзяцей, працэсы выхавання і сацыялізацыі, далучэння да культуры. Такім чынам, дзіця бачыцца прадуктам дарослага, без уласнага ўяўлення аб навакольным асяроддзі і ўласнай рэакцыі на яго. Дарэчы, вельмі цяжка ўявіць сабе дзяцей у якасці пасіўнай, нерухомай істоты без эмоцый. У сучаснай гуманітарнай навуцы ёсць мноства даследаванняў, прысвечаных разгляду дзяцей як аб'ектаў дзейнасці дарослых, аднак погляд на дзіця як суб'екта гістарычнага працэса не ажыццяўляўся. Толькі з сярэдзіны XX ст. вучоныя пачынаюць даследаванне дзяцінства, зыходзячы з кардынальна новага ракурса вывучэння – з пункту гледжання самога дзіцяці. Дзяцінства вывучаюць як акрэсленую субкультуру са сваімі ўласнымі функцыямі, традыцыямі, уласнай сацыяльнай канструкцыяй. Прадпрымаюцца спробы вывучэння свету дарослых вачымі гэтай дастаткова самастойнай субкультуры – света дзяцей. Асабліва істотныя ў гэтым накірунку праведзены даследаванні ў галіне сацыялогіі, псіхалогіі, псіхагісторыі. Першым і шматразова цытуемым сярод гісторыкаў, якія пачалі даследаванне праблемы дзяцінства, з'яўляецца французскі гісторык-дэмограф Ф. Ар'ес – у 1960 г. ён выдаў кнігу «Дзіця і сямейнае жыццё пры старым рэжыме» [3]. Аўтар упершыню растлумачыў, што дзяцінства не проста вызначаны этап у развіцці чалавека, а складанае, шматграннае разуменне, якое не аднойчы змяняецца на працягу гістарычнага працэса. Акрамя самой гісторыі дзяцінства Ф. Ар'еса цікавяць праблемы дынамікі ўзроставых груп, узаемаадносін дарослых і дзяцей у зменлівых вірах гісторыі, сацыяльныя ўстаноўкі, умовы выхавання ў сям'і. Даследчык не толькі высвятляе самое паняцце дзяцінства, але і апісвае адлюстраванне дзяцінства ў выяўленчым мастацтве, дзіцячае адзенне, заняткі, гульні, школьнае навучанне і інш.

Існуе мноства тэорый, якія вызначаюць гісторыю як пастаянны працэс змены пакаленняў, калі чалавечая супольнасць з усім яе назапашаным матэрыяльным, вытворчым, духоўным капіталам перадае ўсё гэта наступнаму пакаленню. Пакаленню, што існуе ў зусім новых умовах жыцця, прымае гэтую спадчыну і далей пераўтварае яе ў новыя формы і г. д. У галіне сацыяльнай гэты працэс змены пакаленняў выглядае як паслядоўны шэраг збліжэнняў паміж дарослым і дзіцем, таму што кожды дарослы, без уліку свайго становішча ў грамадстве, калісьці быў

дзіцём. У псіхалогіі і сацыялогіі нерэдка выкарыстоўваецца выраз «дзіця – бацька мужчыны». Гэта значыць, што эмоцыі, уражанні, матэрыяльнае і духоўнае асяроддзе, у якім знаходзіўся чалавек у дзяцінстве, абавязкова напаўняе ўнутранае жыццё дарослага і з'яўляецца праявай яго далейшага жыцця, учынкаў, памкненняў, сацыялізацыі і месца ў грамадстве. Падобны падыход яскрава прасочваецца ў працы І. С. Кона [13]. Пэўным практычным падцверджаннем гэтай тэорыі з'яўляецца даследаванне пачатку ХХ ст. юрыста М. Ф. Тэадаровіча «Дзецi-злачынцы і суды для іх. Папулярныя эцюды», дзе ён апісвае арганізацыю і дзейнасць спецыяльных судоў для дзяцей-злачынцаў у Расіі. Галоўнай думкай працы з'яўляецца наступнае сцвярджэнне: калі грамадства жадае пазбавіцца ад злачынцаў, яно абавязкова павінна зрабіць дзяцінства шчаслівым [26]. Псіхатэрапеўт Э. Эрыксан у сваёй кнізе «Дзяцінства і грамадства» (1950) пры апісанні выпадкаў сваёй лячэбнай практыкі таксама раскрывае ўзаемазалежнасць дарослага і дзіцячага сусветаў, слушна заўважае, што належачыя да дарослага чалавека маральныя і духоўныя характарыстыкі закладзены ў яго дзяцінстве [28].

Заўважна, што дзяцінства, з'яўляючыся міждысцыплінарнай з'явай, належыць да ліку сталых аб'ектаў даследаванняў у галіне педагогікі, філасофіі, сацыялогіі і псіхалогіі, этнаграфіі. У распрацоўку гісторыі дзяцінства зрабілі ўнёсак некалькі пакаленняў даследчыкаў. Сярод іх трэба адзначыць грунтоўныя этнаграфічныя працы даследчыкаў ХІХ ст.: А. Я. Багдановіча [18], П. В. Шэйна [16], Е. Р. Раманава [21], І. А. Сербава [23], Ю. Ф. Крачкоўскага [14]. У іх працах можна знайсці звесткі аб бытавых і сацыяльных умовах жыцця дзяцей, адносінах да іх у сям'і, традыцыях і абрадах, апісанне дзіцячага адзення, а таксама запісы гульняў, прымавак, казак, калыханак і іншых дзіцячых спеваў. Асобна неабходна выдзеліць працу М. В. Доўнар-Запольскага «Нарысы звычайнага сямейнага права сялян Мінскай губерніі»: даследчык даў не толькі падрабязную характарыстыку ўнутрысямейных адносін і адносін да дзяцей, але і вызначыў месца дзіцяці ў грамадстве згодна з прынятымі ў сялян звычаёвымі нормамі [10].

Неабходна таксама узгадаць даследаванні беларускіх навукоўцаў, якія непасрэдна не звязаны з тэмай дзяцінства, але ў іх змешчана вялікая колькасць метадалагічнага і фактычнага матэрыяла, высноў і трапных характарыстык, без якіх немагчыма ўявіць і даследаваць месца дзяцей у грамадстве. Гэта працы М. В. Біча [6], А. М. Лютага [15], Х. Ю. Бейлькіна [4]. Але толькі ў манаграфіі А. Г. Каханоўскага «Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.)» прадстаўлена

сістэмнае, з прымяненнем сучасных падыходаў, апісанне працэсаў трансфармацыі грамадства другой паловы XIX – пачатку XX ст., саслоўнай структуры і сацыяльных змен у ім [12].

Этнаграфічнае даследаванне дзяцінства паспяхова працягвалася і ў савецкі час. Дастаткова ўзгадаць такія грунтоўныя працы, як «Дзіцячы фальклор» – акадэмічнае выданне Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору [9], а таксама «Сям'я і сямейны быт беларусаў», дзе на прыкладзе шматлікага фактычнага матэрыяла паказана гісторыя трансфармацыі сям'і і сямейных адносінаў, пачынаючы з XIV ст. і да савецкага часу, разгледжаны пытанні выхавання дзяцей у розныя перыяды гісторыі Беларусі, падрабязна апісаны звычаі і абрады, характэрныя для беларускай сям'і [25]. Не менш карыснымі для вывучэння этнаграфіі дзяцінства, заснаванымі на вялікім экспедыцыйным матэрыяле, з'яўляюцца сучасныя працы. Да прыкладу – шматтомнае выданне «Беларусы», падрыхтаванае акадэмічным калектывам аўтараў. Сям'і і сямейным адносінам прысвечаны 5-ты том гэтага выдання [5].

Беларусы на працягу стагоддзяў сфарміравалі ўласную сістэму сацыяльных паводзінаў, якая знайшла сваё адлюстраванне ў метадах выхавання дзяцей, адносінаў да бацькоў, ва ўнутрысямейных адносінах паміж мужам і жонкай. Цікавай у гэтым напрамку даследванняў з'яўляецца манаграфія даследчыцы этнаграфіі дзяцінства Л. В. Ракавай. У сваёй працы на аснове шматлікіх палявых даследаванняў, падрабязнага агляду гістарыяграфічных матэрыялаў і дакладных крыніц аўтар з пазіцый гістарызма разглядае праблемы і эвалюцыю традыцый сямейнага выхавання дзяцей беларусаў [20]. Больш вузкаму напрамку этнаграфічнага вывучэння дзяцінства прысвечана навуковая праца А. Дз. Якубінскай, а менавіта – сацыялізацыі дзяцей беларускіх сялян перыяду другой паловы XIX – пачатку XX ст. Значная ўвага ў манаграфіі нададзена высвятленню праблем забеспячэння здароўя дзяцей, прафілактыцы і лячэнню дзіцячых хвароб, ролі гульні, цацак і фальклорных элементаў у развіцці і выхаванні дзяцей [29].

У якасці найбольш значных у гістарычнай літаратуры звычайна абмяркоўваюцца праблемы сацыялізацыі дзяцей і падлеткаў, роля традыцыйных інстытутаў і форм дзейнасці дзяржавы і грамадскіх арганізацый, вывучаецца сувязь паміж выхаванне дзяцей і іншымі аспектамі сацыяльнай структуры і культуры дадзенага грамадства. Сярод прац па гісторыі выхавання на тэрыторыі Беларусі выдзяляюцца навуковыя даследаванні Е. Г. Андрэевай. Даследчыца прасачыла эвалюцыю развіцця дзіцячых прыютаў і дамоў дагляду на тэрыторыі Беларусі

другой паловы XIX – XX ст. і зрабіла выснову аб тым, што тут мела месца распаўсюджанне педагагічных ідэй рускай, польскай, украінскай народнасцей, а традыцыі падрыхтоўкі кадраў дашкольнага выхавання на працягу ўсяго XIX ст. былі значна мацнейшымі за беларускія, паколькі пераважная большасць настаўнікаў рыхтавалася за межамі Беларусі [1]. Дзейнасць дзяржавы і грамадскіх арганізацый у другой палове XIX ст. у адносінах да дзяцей з адхіленнямі ў развіцці асветлена ў працы беларускага даследчыка І. М. Боблы [7].

Непараўнальна больш даследаванняў па гісторыі дзяцінства разглядаемага перыяду праведзена расійскімі навукоўцамі. Гэтая тэма ў сучаснай расійскай гістарыяграфіі выклікае вельмі вялікую цікавасць. У ліку першых грунтоўных аўтараў разглядаемага перыяду неабходна пазначыць Б. М. Міронава з яго фундаментальнай 3-томнай працай «Расійская імперыя: ад традыцыі да мадэрна» [17]. У шэрагу даследаванняў, якія прысвечаны непасрэдна гісторыі дзяцінства, неабходна выдзеліць манаграфію І. У. Сінавай «Дзеці у гарадскім соцыуме ў другой палове XIX – пачатку XX ст.: праблемы сацыялізацыі, дэвіянтнасці і жорсткага абыходжання». Аўтар з прымяненнем сучасных метадалагічных сродкаў паказала вострую неабходнасць вывучэння гісторыі дзяцінства, акрэсліла падыходы да вызначэння межаў дзяцінства, на прыкладзе шматлікага фактalагічнага матэрыяла зрабіла выснову аб тым, што сям'я з'яўляецца важнейшым інстытутам першаснай сацыялізацыі чалавека [24].

З вышэй сказанага вынікае, што пытанні гісторыі дзяцінства, разам з вывучэннем эвалюцыі заканадаўства, зменаў адносінаў да дзяцей у грамадстве, уздзеяння эканамічных рэформаў вывучаемага перыяду, цесна звязаныя с даследаваннем сям'і і гендэрнай гісторыяй. У прыватнасці, Н. А. Аралавец разгледжаны асаблівасці шлюбных адносінаў гарадскога насельніцтва ў пачатку XX ст., змяненне поглядаў на сямейныя адносіны, прыведзены дэмаграфічныя паказчыкі сям'і і фактары, якія паўплывалі на іх трансфармацыю [2]. Неабходна ўзгадаць працы Н. Л. Пушкаровай па гендэрнай гісторыі, якія сталі класічнымі ў гэтай галіне [19], а таксама даследаванне Л. М. Дзянісавай, прысвечанае раскрыццю прыватнага жыцця, побыта і ролі жанчыны-сялянкі ў савецкай вёсцы [8].

Новымі падыходамі да даследавання гісторыі дзяцінства XX ст. вызначаецца навуковая праца А. А. Сальнікавай «Расійскае дзяцінства ў XX стагоддзі: гісторыя, тэорыя і практыка даследавання». Цікавасць выклікае той факт, што аўтар для раскрыцця праблемы прапануе выкарыстоўваць у якасці крыніцы ўспаміны дзяцей аб сваім недалёкім

мінулым, абгрунтоўваючы гэта тым, што ўспаміны дарослых аб сваім дзяцінстве заўсёды выглядаюць прыгожымі і «светлымі». Дзеці ў гэтым выпадку больш крытычныя і аб'ектыўныя. Тым самым А. А. Сальнікава разглядае дзяцей як самастойных суб'ектаў гістарычнага даследавання, пазбаўленых стэрэатыпаў «дарослага» свету [22].

Вялікая колькасць прац расійскіх гісторыкаў прысвечана раскрыццю праблемы сацыяльнага дагляду і апякунства, утварэнню вялікай колькасці дабрачынных установаў напрыканцы XIX ст. і, асабліва, у пачатку XX ст. Існаванне такіх праяў, безумоўна, сведчыць аб працэсах фарміравання ў Расійскай імперыі грамадзянскай супольнасці, а таксама аб праблеме дэвіяцыі ў дзіцячым асяроддзі і росце вялікай колькасці маргінальных элементаў (негатыўных фактараў трансфармацыйных змен у грамадстве).

Гісторыя дзяцінства другой паловы XIX – пачатку XX ст. – вельмі важная і складаная галіна для даследавання. Але вывучэнне гісторыі дзяцінства сутыкаецца з шэрагам розных складаных праблем. Прымяненне міждысцыплінарных падыходаў да вывучэння дзяцінства ў беларускім грамадстве, звяртанне як да сусвету дзяцей і дзяцінства, так і да сусвету дарослага грамадства дапамогуць зрабіць унёсак у паглыбленне нашага разумення беларускага грамадства другой паловы XIX – пачатку XX ст.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. *Андреева Е. Г.* Гуманистические идеи первоначального воспитания в дореволюционной Белоруссии. Минск : МПИ, 1985. 96 с.

2. *Араловец Н. А.* Городская семья в России, 1897–1926 гг.: историко-демографический аспект. М. : РИО ИРИ РАН, 2003. 233 с.

3. *Арьес Ф.* Ребенок и семейная жизнь при Старом порядке / Пер. с франц. Я. Ю. Старцева при участии В. А. Бабинцева. Екатеринбург : Изд-во Урал. ун-та, 1999. 416 с.

4. *Бейлькин Х. Ю.* Сельскохозяйственный рынок Белоруссии (1861–1914 гг.). Минск : Навука і тэхніка. 1989. 280 с.

5. Беларусы. Сям'я / В. К. Бандарчык, Г. М. Курыловіч, Т. І. Кухаронак і [інш.]. Мінск : Бел. навука, 2001. Т. 5. 375 с. .

6. *Бич М. О.* Рабочее движение в Белоруссии в 1861–1903 гг. Минск : Навука і тэхніка. 1983. 278 с.

7. *Бобла И. М.* Развитие специального обучения и воспитания аномальных детей в дореволюционной Белоруссии. Минск : 1983. 86 с.

8. *Денисова Л. Н.* Судьба русской крестьянки в XX веке: брак, семья, быт. М. : «Памятники исторической мысли»; «Российская политическая энциклопедия» (РОССПЭН), 2007. 480 с.

9. Дзіцячы фальклор / Акадэмія навук Беларускай ССР. Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Мінск : Навука і тэхніка, 1972. 733 с.

10. *Довнар-Запольский М. В.* Исследования и статьи. Киев : издание А. П. Сапунова, 1909. Т. 1. II. 487 с.

11. Законы о детях. Сборник постановлений действующего законодательства, относящихся до малолетних и несовершеннолетних с приложением Свода разъяснений по кассационным решениям Сената / Сост. Я. А. Канторович. СПб., 1899.

12. *Каханоўскі А. Г.* Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861−1914 гг.). Мінск : БДУ. 2013. 335 с.

13. *Кон И. С.* Ребенок и общество. Учеб. пособие для студ. высш. учеб. заведений. М. : Изд. центр «Академия». 2003. 336 с.

14. *Крачковский Ю. Ф.* (1840–1903) Быт западнорусского селянина / сочинение Юл. Ф. Крачковского. М. : издание Императорского Общества истории и древностей российских при Московском университете, 1874. 212 с.

15. *Лютый А. М.* Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII − первой половине XIX в. Минск : Навука і тэхніка. 1987. 181 с.

16. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Собраны и приведены в порядок П. В. Шейном. Т. III. СПб. : 1902. 521 с.

17. *Миронов Б. Н.* Российская империя: от традиции к модерну : в 3 т. СПб. : Дмитрий Буланин, 2014. Т. 1. 896 с.

18. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Этнографический очерк А. Е. Богдановича. Гродно : Губернская Типография. 1895. 186 с.

19. *Пушкарева Н. Л.* Частная жизнь женщины в доиндустриальной России. X – начало XIX в. Невеста, жена, любовница. М. : «Ладомир», 1997; Русская женщина: история и современность. М. : «Ладомир», 2002; Бытовое насилие в истории российской повседневности (XI–XXI вв.). СПб. : ЕУ СПб., 2012.

20. *Ракава Л. В.* Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XIX−XX стст. Мінск: Беларус. навука, 2009. 311 с.

21. *Романов Е. Р.* Белорусский сборник. Вильно : 1912. Вып. VIII–IX. 1912.

22. *Сальникова А. А.* Российское детство в XX веке: История, теория и практика исследования. Казань : Казанский гос. ун-т им. В. И. Ульянова-Ленина, 2007. 256 с.

23. *Сербов И. А.* Белоруссы-сакуны. Краткий этнографический очерк. Петроград : Тип. Имп. Акад. Наук, 1915. 180 с.

24. *Синова И. В.* Дети в городском российском социуме во второй половине XIX – начале XX в.: проблемы социализации, девиантности и жестокого обращения. СПб. : Дмитрий Буланин, 2014. 288 с.

25. Сям'я і сямейны быт беларусаў / В. К. Бандарчык, Г. М. Курыловіч, Л. В. Ракава [і інш.]. Мінск : Навука і тэхніка, 1990. 256 с.

26. *Теодорович М. Ф.* Дети-преступники и суды для них. Варшава, 1914. 31 с.

27. Уложение о наказаниях уголовных и исправительных. Изд. 1885 г., со включением статей по Продолжениям 1890 и 1891 гг. СПб. : Гос. совет. 683 с.

28. *Эрик Г.* Эриксон. Детство и общество. Изд. 2-е, перераб. и доп. / Пер. с англ. СПб. : Ленато, АСТ, Фонд «Университетская книга», 1996. 592 с.

29. *Якубінская А. Дз.* Традыцыйная сацыялізацыя дзяцей беларускіх сялян у другой палове XIX – першай палове XX ст. Мінск : РІВШ, 2010. 118 с.

***Литвиновская Ю. И.***

*УО «Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники»* (*г. Минск, Республика Беларусь*)

## СОБЫТИЯ ВОЙНЫ 1812 ГОДА В ДОКУМЕНТАХ БЕЛОРУССКИХ АРХИВОВ

Архивные материалы – база любого серьёзного исторического исследования. Без их использования освещение конкретных исторических событий будет неполным, мы не сможем добиться объективной картины происходившего, произвести качественный анализ и сделать аргументированные выводы. В Беларуси крупнейшими хранилищами документов по дореволюционному периоду её развития являются исторические архивы в Минске и Гродно. Именно на них опираются в первую очередь в своих исследованиях белорусские исследователи.

Война 1812 г. – одно из наиболее значительных событий в истории дореволюционной России. Она явилась испытанием прочности государства и не случайно получила в российской историографии название «Отечественной». Многие события происходили на территории Беларуси, на население которой легла основная тяжесть военных повинностей, что привело к величайшим бедствиям для жителей городов и деревень, разорению и опустошению края. В белорусских архивах сохранились многие документы той эпохи, которые проливают свет, прежде всего, на события социально-экономического характера.

Основной комплекс неопубликованных документальных источников находится в Национальном историческом архиве Беларуси (НИАБ): царские указы и манифесты, отчёты губернаторов, переписка губернских учреждений с поветовыми, различного рода рапорты, сведения о сдаче провианта и фуража. А также обобщенные и отдельные расписки, многочисленные ходатайства помещиков о снижении бремени военных поставок, оказании помощи и т.д.

В фонде Белорусского генерал-губернатора [12] имеется ряд важных свидетельств, касающихся событий войны 1812 г. К ним можно отнести показания бывших жителей местечка Краснополье Полоцкого повета